НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

# ИНСТИТУТ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ И СТАНОВЛЕНИЕ НАУКИ В БЕЛАРУСИ

## К 90-летию создания Института белорусской культуры



*Материалы Международной научной конференции*

*Минск, 8–9 декабря 2011 г.*

НАЦИОНАЛЬНАЯ АКАДЕМИЯ НАУК БЕЛАРУСИ
Отделение гуманитарных наук и искусств
Институт истории
Комиссия по истории науки

# ИНСТИТУТ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ И СТАНОВЛЕНИЕ НАУКИ В БЕЛАРУСИ

К 90-летию создания
Института белорусской культуры

*Материалы
Международной научной
конференции*

*Минск, 8–9 декабря 2011 г.*

Минск
«Беларуская навука»
2012

УДК 008(=161.3):[001.891:005.71](476)(082)
ББК 71(4Беи)я43
И 71

Редакционная коллегия:

А. А. Коваленя (сопредседатель)
В. В. Данилович (сопредседатель)
М. Г. Жилинский (заместитель сопредседателя)
Г. В. Корзенко (заместитель сопредседателя)
Т. С. Буденкова (ответственный секретарь)
М. К. Кошелев, В. И. Кузьменко, В. С. Сакович,
Н. В. Смехович, А. П. Соловьянов, Н. В. Токарев, С. А. Третьяк

Рецензенты:

доктор исторических наук Н. М. Забавский
кандидат исторических наук Е. А. Кривичанина

*Сборник подготовлен в рамках выполнения задания «История, культура, общество, государство» 1.3.02 «Наука, образование и культура в социальной истории Беларуси (XX–XXI вв.)» подпрограммы № 1 «История, духовная и материальная культура белорусского народа» как составной части государственной комплексной программы научных исследований на 2011–2015 гг. «Гуманитарные науки как фактор развития белорусского общества и государственной идеологии»*

**ISBN 978-985-08-1464-7**

© Оформление. РУП «Издательский дом «Беларуская навука», 2012

## *ПЛЕНАРНОЕ ЗАСЕДАНИЕ*

*А. А. Каваленя*

### ІНСТЫТУТ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ – ШЛЯХ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ

Шаноўныя ўдзельнікі Міжнароднай навуковай канферэнцыі!

Паважаныя госці і калегі!

Сёння ў гэтай зале сабраліся прадстаўнікі вядучых устаноў навукі, культуры і адукацыі Рэспублікі Беларусь, а таксама замежных краін з нагоды 90-й гадавіны заснавання Інстытута беларускай культуры, які паклаў пачатак фарміраванню беларускай акадэмічнай навукі. Я ўпэўнены, што праца нашага навуковага форума дапаможа абмеркаваць многія навуковыя праблемы. Узровень навуковых даследаванняў, асабліва грамадазнаўча-гуманітарнага напрамку, – вызначальны фактар сацыяльна-эканамічнага, грамадска-палітычнага і культурнага развіцця дзяржавы. У нашай краіне разгорнуты актыўныя навуковыя даследаванні па многіх напрамках прыродазнаўчых, тэхнічных і гуманітарных навук.

Як гуманітарый, не магу не адзначыць таго факта, і аб гэтым сцвярджаюць многія спецыялісты, што ў XXI стагоддзі грамадства асабліва запатрабуе даследаванні гуманітарных навук. Гэта ў першую чаргу абумоўлена шэрагам абставін, якія актыўна ўплываюць на становішча чалавека ў сусветным грамадстве. Нельга не заўважыць таго, што ў наш час адбываецца актыўнае змяненне светапогляду людзей пад уплывам шэрагу фактараў. Па-першае, працэсаў глабалізацыі, па-другое, змяненняў

паўсядзённай камунікацыі людзей, па-трэцяе, новых магчымасцяў змянення прыродных якасцяў самога чалавека.

Апошнім часам, асабліва ў перыяд фінансава-эканамічных крызісаў, значна актывізуецца грамадская думка. Нават узнікаюць пытанні аб адказнасці навук, у першую чаргу эканамічных, сацыялагічных, юрыдычных, чые вынікі могуць быць у аснове прыняцця найбольш верагодных сацыяльна-тэхналагічных рашэнняў, за становішча ў грамадстве. Між тым, многія праблемы грамадскага жыцця так ці інакш звязваюцца з наступствамі глабалізацыі. Сёння ў асэнсаванні многіх людзей глабалізацыя ў значнай ступені ўспрымаецца як адмоўны працэс. Лічыцца, што яна негатыўна ўплывае на сацыяльна-эканамічнае развіццё, асабліва невялікіх краін, прыводзіць да ніверліравання культурнага жыцця, садзейнічае распальванню нацыяналістычных настроеў, ўзнікненню і пашырэнню тэрарызму і г. д.

Варта пазначыць, што глабалізацыя пачалася не ўчора і не сёння, што гэта аб'ектыўны працэс, які немагчыма адмяніць, тым больш супрацьстаяць яму. Некаторыя аўтары сцвярджаюць, што працэсы глабалізацыі пачаліся ў канцы ХХ стагоддзя, з чым цяжка пагадзіцца. Звернем увагу на той факт, што кожная гістарычная з'ява, падзея, альбо працэс першасна фармулююцца як ідэя інтэлектам чалавека. Уяўляецца, што яшчэ ў глыбокай старажытнасці ў людзей маглі ўзнікаць пэўныя светапоглядныя ўяўленні, а калі чалавек стаў асэнсоўваць сябе як разумную істоту, ў яго, безумоўна, з'явілася жаданне зазірнуць за межы арыялу свайго рассялення.

У рэчышчы выказанай думкі, мяркую, будзе карысным звярнуць увагу на шэраг вызначальных падзей, што адбыліся ў працэсе развіцця чалавечай цывілізацыі, якія красамоўна сведчаць аб аб'ектыўнай сутнасці і генезісе развіцця глабалізацыі. Тут неабходна назваць, на наш погляд, цэлы шэраг агульнавядомых і найбольш значных падзей, якія адбыліся ў працэсе развіцця сусветнага грамадства. Не прэтэндуючы на ісціну, звернем увагу толькі на тыя, што безумоўна паўплывалі на сусветнае грамадскае жыццё. У гэтым шэрагу назавём неалітычную рэвалюцыю, вялікае перасяленне народаў, крыжовыя паходы, вя-

лікія геаграфічныя адкрыцці, навуковыя адкрыцці XVIII–XX стагоддзяў, Першую і Другую сусветныя войны, асваенне касмічнай прасторы, развіццё транспартных і камунікатыўна-інфармацыйных тэхналогій, сродкаў масавай інфармацыі, радыё і тэлебачання. Гэтыя і некаторыя іншыя грамадска-палітычныя падзеі і навукова-тэхнічныя адкрыцці сталі важнымі вехамі развіцця сусветнага грамадства, значна актывізавалі працэс глабалізацыі і яе размах.

На працягу гістарычнага развіцця Беларусі, якая знаходзіцца не толькі ў цэнтры еўрапейскай цывілізацыі, але і на перакрыжаванні шляхоў зносін, у большай ці ў меншай ступені яна пастаянна адчувала, а іншы раз станавілася ў цэнтры сусветных грамадска-палітычных падзей. Наша геапалітычнае месца не толькі вызначыла многія складанасці этнагенезу, нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, грамадска-культурнага і духоўнага жыцця беларускага народа, але і пэўным чынам паўплывала і на стан развіцця айчыннай навукі.

Асэнсаванае разуменне сучасных грамадска-палітычных падзей, што адбываюцца ў сусветным грамадстве, іх уплыву на Беларусь патрабуе паглыбленага і ўважлівага позірку ў мінулае. Пачатак айчыннай навукі мае глыбокія карані. Яе вытокі ўзыходзяць у глыб нашай гісторыі. Погляд у мінулае айчыннай навуковай думкі, аналіз гістарычных старонак яе развіцця дазваляюць убачыць не толькі складаныя і супярэчлівыя падзеі, але і многае з таго, што дае падставы ганарыцца дасягненнямі, некаторыя з якіх маюць сусветнае значэнне.

Як сведчыць вопыт, зараджэнне першых элементаў навуковых ведаў непарыўна звязана з гісторыяй фарміравання беларускага грамадства. Развіццё навукі вызначалася не толькі логікай руху навуковых ідэй, але галоўным чынам самім жыццём, пануючымі рэлігійнымі, філасофскімі, ідэалагічнымі плынямі і палітычнымі стасункамі.

Вядома, што фарміраванне навукі было цесна звязана са станаўленнем, з ростам гарадоў і патрэбамі вытворчасці, карэннымі праблемамі нацыянальнага і сацыяльнага развіцця грамадства. Навуковыя веды арганічна ўваходзілі ў матэрыяльнае і духоўнае

жыццё грамадства і адыгрывалі вызначальную ролю ў развіцці народа і краіны.

Беларуская зямля нарадзіла велізарную колькасць выдатных грамадскіх дзеячаў, вучоных, паэтаў і пісьменнікаў. Многія імёны нашых суайчыннікаў навечна ўпісаны ў сусветны летапіс навукі і культуры, з'яўляюцца нацыянальным гонарам. Ля вытокаў збірання, назапашвання і распаўсюджання ведаў аб беларускім народзе, яго культуры і звычаях стаялі выдатныя асветнікі Ефрасіння Полацкая і Кірыла Тураўскі.

Нягледзячы на шматлікія цяжкасці і супярэчнасці нацыянальнага і дзяржаўнага станаўлення, беларускі народ даў сусветнай цывілізацыі шматлікія імёны выдатных гуманістаўасветнікаў.

У краінах Еўропы добра ведалі не толькі імёны Францыска Скарыны, Міколы Гусоўскага, Сымона Буднага. У шэрагу вядомых імёнаў Пётр Мсціславец (XVI ст.) – друкар, прыхільнік адукацыі беларускага народа, які выдаў у 1575 годзе Евангелле; Яўстафій Валовіч (1520–1587) – дзяржаўны дзеяч, адзін з аўтараў Статута ВКЛ 1566 года, праціўнік прыняцця Люблінскай уніі; Васіль Цяпінскі (1530-я–1603) – мысліцель-гуманіст і кнігавыдавец, які выдаў у 1580 годзе Евангелле на беларускай мове; Леў Сапега (1557–1633) – дзяржаўны дзеяч, канцлер ВКЛ, які фінансаваў выданне Статута ВКЛ 1588 года; Ілля Капіевіч (1651–1714) – асветнік, выдавец звыш 20 кніг, пісьменнік, стваральнік кірылічнай грамадзянскай азбукі.

Не можа не выклікаць захаплення імя нашага суайчынніка Казіміра Семяновіча. Менавіта ён першым у сусветнай практыцы абгрунтаваў ідэю шматпрыступкавай ракеты, падмацаваўшы сваё вынаходніцтва падрабязнымі чарцяжамі і малюнкамі. Яго ідэі больш чым на два стагоддзі апярэдзілі Цыялкоўскага.

Знакамітай асобай у гісторыі айчыннай і сусветнай культуры з'яўляецца выдатны Палачанін, асветнік, паэт, драматург, педагог, перакладчык, царкоўны і грамадскі дзеяч Сімяон Полацкі. Ён заснаваў «лацінскую» школу і незалежную ад патрыяршай цэнзуры друкарню, як перакладчык пазнаёміў грамадскасць з многімі творамі тагачаснасці: «Казанне пра Магамета», «Таста-

мент, або Запавет Васіля, цара грэчаскага», «Гісторыя пра Варлаама і Іасафа». Сусветную славу яму прынеслі выдадзеныя пасмяротна два вялікія зборнікі: «Вертаград мнагацветны» і «Рыфмалагіён, ці Вершаслоў».

Выхадзец з Навагрудчыны, Антоній Тызенгаўз быў заснавальнікам шматлікіх мануфактур, культурных устаноў, парафіяльных школ для сялянскіх і мяшчанскіх дзяцей на беларускіх землях, а таксама першага ў Беларусі перыядычнага выдання – «Гродзенскай газеты».

Нельга без павагі ўспамінаць імя знакамітага астранома і асветніка, ураджэнца Гродзенскай зямлі Марціна Пачобута-Адляніцкага. Ён зрабіў значны ўклад у развіццё асветы, папулярызацыю прыродазнаўчых і матэматычных ведаў, актыўна працаваў у Адукацыйнай камісіі Рэчы Паспалітай. З'яўляўся арганізатарам і дырэктарам Віленскай абсерваторыі, вывучаў планету Меркурый, адкрыў невядомае сузор'е, вызначыў дакладныя каардынаты многіх населеных пунктаў у Беларусі і Літве. Доўгі час Пачобут-Адляніцкі працаваў рэктарам рэарганізаванай у Галоўную школу Вялікага княства Літоўскага Віленскай езуіцкай акадэміі. За заслугі ў прыродазнаўстве ён выбіраўся членам-карэспандэнтам Парыжскай акадэміі навук і Лонданскага астранамічнага таварыства.

Прызнаным спецыялістам у галіне батанікі, геалогіі, мінералогіі, заалогіі, ветэрынарыі і сельскай гаспадаркі быў выхадзец з Лідчыны Станіслаў Юндзіл. Адным з першых ён даследаваў раслінны свет Беларусі, напісаў у 1791 г. кнігу «Апісанне дзікарослых раслін у правінцыі Вялікага княства Літоўскага, зробленае паводле сістэмы Лінея», падрыхтаваў у якасці падручнікаў «Асновы батанікі» і «Кароткі курс заалогіі». Вялікую цікавасць выклікалі яго навуковыя працы «Аб саляных радовішчах і солі ў Стоклішках» і «Прыкладная батаніка, ці звесткі аб уласцівасцях і ўжытку раслін у гандлі, эканоміцы, рукадзеллі, аб іх радзіме, размнажэнні і даглядзе». Намаганнямі Юндзіла ў Віленскім універсітэце была створана багатая калекцыя раслін, якая, дзякуючы яго актыўнай карэспандэнцыі і абмену з айчыннымі і замежнымі батанікамі, налічвала 6500 відаў.

Малавядома, але факт, што ўраджэнец Магілёва, таленавіты прыродазнаўца, біёлаг-эвалюцыяніст, батанік-сістэматык Павел Гаранінаў на 25 гадоў (у 1834 г.) раней за Чарльза Дарвіна (у 1859 г.) абгрунтаваў эвалюцыйную тэорыю паходжання расліннага і жывёльнага свету.

Вядомым у Еўропе прыхільнікам і прапагандыстам эвалюцыйнай тэорыі быў прыродазнаўца і медык Бенедыкт Дыбоўскі, які нарадзіўся ў маёнтку Адамарын Вілейскага павета Мінскай губерні. У сваіх працах і лекцыях Дыбоўскі даказваў, што жывёльны і раслінны свет развіваецца паводле натуральных законаў.

Гонар і павагу выклікаюць даследаванні выдатнага заолага, прафесара Пецярбургскага ўніверсітэта Аляксандра Кавалеўскага, выхадца з Віцебшчыны. У яго працах знайшла ўвасабленне ідэя гармоніі ў развіцці жывых арганізмаў. Грунтуючыся на эвалюцыйнай тэорыі, ён заклаў фундамент эвалюцыйна-параўнальнай эмбрыялогіі.

Нельга не ўзгадаць навуковую спадчыну вядомага ў Еўропе навукоўца-прыродазнаўца Канстанціна Тызенгаўза, які нарадзіўся ў мястэчку Жалудок, што на Гродзеншчыне. У 1812 годзе прымаў актыўны ўдзел у вайне супраць Напалеона. Пасля заканчэння ваенных дзеянняў цалкам заняўся арніталогіяй. Яго пяру належаць фундаментальныя працы на польскай мове «Асновы арніталогіі, або навукі пра птушак» і «Усеагульная арніталогія, або Апісанне птушак усіх частак свету». У сваім маёнтку ў Паставах стварыў арніталагічны музей, у якім было некалькі тысяч экспанатаў птушак з Беларусі, Літвы і Украіны. Захапляўся жывапісам, быў вучнем мастака Яна Рустэма. Стварыў у Паставах сваю карцінную галерэю. Апрацаваў ілюстрацыйны матэрыял да кнігі У. Тачаноўскага «Заалогія польскіх птушак» (1862 г).

Прыкметны след у гісторыі тэхнічнай думкі XIX ст. пакінуў наш зямляк Казімір Чарноўскі, які яшчэ ў 1825–1829 гг. распрацаваў праект падводнага судна.

Гонарам нашай краіны з'яўляецца шматгранная навуковая і практычная дзейнасць ураджэнца Карэліцкага раёна Ігната Дамейкі. Адукацыю Дамейка атрымаў у Шчучынскай кляштарнай школе ордэна піяраў і стаў студэнтам прыродазнаўчага аддзя-

лення фізіка-матэматычнага факультэта Віленскага ўніверсітэта. Затым Дамейка пераехаў у Парыж, тут скончыў Вышэйшую школу горнай справы пры Сарбоне. У 1837 годзе яго запрасілі у Чылі, дзе ў сталічным універсітэце спачатку ўзначаліў кафедру хіміі, а ў 1867–1883 гг. займаў пасаду рэктара. У гонар заслуг перад навукай яго прозвішчам названы мінерал дамейкіт, выкапнёвы слімак *Nautilus Domeycus,* фіялка *Viola Domeykiana,* аманіт чылійскі *Amonites Domeykanus,* рабочы пасёлак у Чылі, хрыбет у Андах. І. Дамейко з'яўляўся ганаровым членам польскай і многіх еўрапейскіх Акадэмій. Сёння ў Санцьяга стаіць помнік «Грандэ Эдукатору», у яго доме зроблены мемарыяльны музей, а адзін з партовых гарадоў Чылі названы Пуэрта-Дамейка.

Грунтуючыся на рацыянальна-крытычным мысленні, вольным ад рэлігійнага светаўяўлення, гуманітарныя даследаванні атрымалі сваё інтэнсіўнае развіццё ў канцы XIX стагоддзя. У фундаментальных працах Ігнацція Даніловіча, Мітрафана Доўнар-Запольскага, Яўхіма Карскага, Міхаіла Каяловіча, Івана Лапо, Мікалая Нікіфароўскага, Яна Насовіча, Еўдакіма Раманава, Аляксея Сапунова, Кастуся Тышкевіча, Яўстафія Тышкевіча, Яна Чачота, Паўла Шэйна, Мікалая Янчука былі ўпершыню прадстаўлены невядомыя грамадскай і замежнай думцы старонкі гісторыі матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Менавіта толькі дзякуючы іх працам быў закладзены трывалы навуковы падмурак абгрунтавання і паспяховага фарміравання беларускай нацыі і дзяржаўнасці.

Важным дасягненнем у сферы беларускай культуры XIX – пачатку XX стагоддзя з'яўляецца адраджэнне і наступнае развіццё літаратурнага працэсу. На яго магутнай хвалі зарадзілася і пусціла глыбокія карані беларускае прафесійнае тэатральнае мастацтва. У пачатку XX стагоддзя актыўна стала развівацца беларуская літаратурная мова, якая аказвала вырашальны ўплыў на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і нацыянальнай культуры беларускага народа, з'явіўся беларускі перыядычны друк. Бурнае развіццё беларускай мовы, яе фанетычных, лексічных і граматычных нормаў адбылося з прыходам у літа-

ратуру Францішка Багушэвіча, Янкі Лучыны, Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цёткі і інш.

Вялікая заслуга ў развіцці беларускага нацыянальна-культурнага руху і ў распаўсюджанні нацыянальнай асветы належыць кнігавыдавецкаму таварыству «Загляне сонца і ў наша аконца», заснаванаму Б. Эпімах-Шыпілам у Санкт-Пецярбургу ў 1906 годзе. Таварыства паклала пачатак сістэматычнаму выданню літаратуры на беларускай мове. Пазней адкрыліся яшчэ 6 беларускіх выдавецтваў. Толькі за 1908–1914 гады ў свет выйшлі 77 беларускіх кніг агульным тыражом 226 тысяч экземпляраў. У 1906–1915 гадах легальна выдавалася беларуская газета «Наша ніва», якая стала ідэйна-арганізацыйным цэнтрам беларускага нацыянальнага руху і сыграла велізарную ролю ў фарміраванні і станаўленні нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.

Як бачна, навуковыя веды за невялікі гістарычны адрэзак часу, дзякуючы намаганням айчынных навукоўцаў і грамадскіх дзеячаў, атрымалі дастаткова шырокае развіццё. Значнага росквіту беларуская навука дасягнула ў савецкі перыяд. Знамянальнымі падзеямі ў навуковым жыцці Беларусі стала адкрыццё ў 1921 г. Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і заснаванне ў 1922 г. буйнога навукова-даследчага цэнтра – Інстытута беларускай культуры, які з’явіўся правобразам Беларускай Акадэміі навук. У адпаведнасці з пастановай Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Саўнаркама Беларускай ССР ад 13 кастрычніка 1928 года «Аб рэарганізацыі Інстытута беларускай культуры ў Беларускую Акадэмію навук» было абвешчана аб стварэнні Беларускай Акадэміі навук. Яе ўрачыстае адкрыццё адбылося ў Мінску 1 студзеня 1929 года. Першы склад сапраўдных членаў Беларускай Акадэміі навук аб’ядноўваў 23 чалавекі. Гэта былі вядомыя беларускія навукоўцы і грамадскія дзеячы, а таксама 9 прадстаўнікоў ад Расіі і Украіны. Першым прэзідэнтам Беларускай Акадэміі навук быў абраны гісторык, член Бюро ЦК КП(б) Б У. М. Ігнатоўскі. У складзе БАН у той час працавалі першыя акадэмікі: Я. М. Афанасьеў, М. Ф. Бліадухо, С. Я. Вольфсан, Г. І. Гарэцкі, М. В. Грэдзінгер, А. Д. Дубах, М. М. Дурнаво, Д. Ф. Жылуновіч (Цішка Гартны), І. І. Замоцін, В. У. Ластоўскі, І. Ю. Лёсік,

І. Д. Луцэвіч (Янка Купала), М. К. Малюшыцкі, С. Ю. Матулайціс, К. М. Міцкевіч (Якуб Колас), С. М. Некрашэвіч, І. А. Пятровіч, У. І. Пічэта, Б. А. Тарашкевіч, П. А. Туткоўскі, А. М. Ясінскі.

За перадваенныя гады навукоўцы Акадэміі навук на чале з яе прэзідэнтамі У. М. Ігнатоўскім (1929–1931 гг.), П. О. Горыным (1931–1936 гг.) і І. З. Суртой (1936–1937 гг.) змаглі многае здзейсніць у галіне адраджэння і вывучэння нацыянальнай гісторыі, мовы, літаратуры і этнаграфіі Беларусі. Быў пакладзены пачатак даследаванням у галіне біялогіі, геалогіі, медыцыны, фізіка-матэматычных і хімічных навук. Працы акадэмічных навукоўцаў былі адзначаны чатырма Дзяржаўнымі прэміямі СССР. Фарміраванне навуковых кадраў, іх рост і развіццё адбывалася разам з развіццём сацыяльна-эканамічнага, культурнага і палітычнага будаўніцтва Беларусі. Ужо ў 1929 годзе акадэмічная супольнасць аб’ядноўвала 128 чалавек, сярод іх – 87 навуковых супрацоўнікаў.

Вядома, гістарычны час і сацыяльна-палітычнае жыццё, якое разгарнулася ў 30-я гады XX стагоддзя ў СССР аказвала адмоўны ўплыў на асноўныя накірункі дзейнасці навуковых устаноў. Асабліва негатыўна паўплывалі на развіццё акадэмічнай навукі рэпрэсіі 30-х гадоў. Праблема абвастрылася тым, што беларускае акадэмічнае навуковае асяроддзе было вынішчана на этапе яго станаўлення, калі толькі пачалі фарміравацца навуковыя школы. Так, ужо 6 снежня 1930 года СНК БССР прыняў пастанову аб выключэнні са складу акадэміі першых акадэмікаў: Г. І. Гарэцкага, А. Д. Дубаха, В. У Ластоўскага, І. Ю. Лёсіка. С. М. Некрашэвіча, У. І. Пічэты, якія ў гэты час яшчэ знаходзіліся пад следствам. У 1937–1938 гг. беларуская інтэлектуальная эліта панесла велізарныя, непапраўныя страты. Па неабгрунтаваных абвінавачаннях былі рэпрэсіраваны вядомыя дзеячы навукі і культуры, арганізатары навукі, у тым ліку акадэмікі: Я. М. Афанасьеў, Ц. Л. Бурсцін, П. В. Горын, Т. Ф. Домбаль, І. І. Замоцін, Д. Ф. Жылуновіч, С. Ю. Матулайціс, П. Я. Панкевіч, І. А. Пятровіч, В. А. Сербента, І. З. Сурта, Б. А. Тарашкевіч, В. К. Шчарбакоў. За гады рэпрэсій ахвярамі сталі звыш 140 вучоных і супрацоў-

нікаў акадэміі, прычым многія былі прыгавораны да вышэйшай меры пакарання.

Паступальнае развіццё беларускай навукі парушылася Вялікай Айчыннай вайной. Разам з усім беларускім народам айчынныя навукоўцы пераадольвалі суровыя ваенныя выпрабаванні. Некаторая частка беларускіх вучоных была эвакуіравана ў савецкі тыл, дзе змагла ўключыцца ў рашэнне задач, якія паўсталі перад навукай у гады вайны. На чале з прэзідэнтам АН БССР К. В. Горавым (1938–1947 гг.) вучоныя актыўна ўдзельнічалі ў рашэнні пытанняў, звязаных з пашырэннем і павелічэннем сыравінных рэсурсаў краіны, распрацоўвалі новыя і ўдасканальвалі існуючыя тэхналагічныя працэсы ў вытворчасці, праводзілі даследаванні па павышэнні ўраджайнасці сельскагаспадарчых культур, пашырэнні іх пасеваў. Не спыняліся працы і ў галіне гуманітарных навук. Навуковыя распрацоўкі садзейнічалі ўзмацненню ваенна-эканамічнага патэнцыялу Савецкага Саюза, а таксама спрыялі маральна-палітычнай мабілізацыі савецкіх людзей на адпор ворагу.

Больш за 100 супрацоўнікаў Акадэміі вялі барацьбу супраць германскіх захопнікаў на фронце і ў радах партызан, удзельнічалі ў антыфашысцкім падполлі. Яны да канца выканалі свой абавязак, паклаўшы сілы і веды на алтар Вялікай Перамогі. Іх гераічныя подзвігі адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Ордэнамі Леніна былі ўзнагароджаны акадэмікі М. М. Нікольскі, У. М. Перцаў, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга – акадэмікі Ц. М. Годнеў, А. Р. Жэбрак, О. К. Кедраў-Зіхман, В. А. Лявонаў, А. Я. Пракапчук, члены-карэспандэнты Д. М. Голуб, М. Ф. Ярмоленка.

Асэнсоўваючы гэты складанейшы перыяд айчыннай навукі, можна сцвярджаць, што толькі дзякуючы найвышэйшаму, прыроднаму інтэлектуальна-генетычнаму патэнцыялу беларускага народа, яго адвечнай празе да ведаў, былі пераадолены велізарныя страты. Так, на пачатак 1945 года узнавілі сваю дзейнасць толькі 8 акадэмічных інстытутаў. У пасляваенныя гады навукоўцам Акадэміі навук на чале з прэзідэнтамі А. Р. Жэбракам (1947 г.) і М. І. Грашчанковым (1947–1951 гг.) многае прыйшлося пачы-

нацць спачатку. Асабліва значнай праблемай быў востры недахоп кадраў. Шмат было здзейснена па ўмацаванні і пашырэнні навуковых устаноў і падрыхтоўцы навуковых кадраў. Ужо ў 1951 годзе у Акадэміі дзейнічала 29 навукова-даследчых устаноў, у тым ліку 16 інстытутаў. Агульная колькасць супрацоўнікаў дасягнула 1234 чалавекі. У гэты час у Акадэміі працавалі 33 акадэмікі, 27 членаў-карэспандэнтаў, 55 прафесараў і дактароў навук, 165 кандыдатаў навук.

Узнікненне ў сярэдзіне 50-х гадоў новых галін народнай гаспадаркі рэспублікі выклікала патрэбу хуткага развіцця фізіка-матэматычных і тэхнічных навук. Дзеля вырашэння гэтай задачы на працу ў Беларусь былі запрошаны многія вядомыя навукоўцы з РСФСР: фізікі Б. І. Сцяпанаў, А. Н. Сеўчанка, М. А. Ельяшэвіч, М. М. Сірата, матэматыкі М. П. Яругін, У. І. Крылоў, цеплафізік А. В. Лыкаў, матэрыялавед В. П. Севярдзенка, буйны спецыяліст у галіне ядзернай энергетыкі А. К. Красін, фізіёлаг І. А. Булыгін, генетык М. В. Турбін і інш.

Дзякуючы дзейснай дапамозе расійскіх вучоных і матэрыяльнай падтрымцы кіраўніцтва СССР, ужо 28 красавіка 1962 года ў вёсцы Сосны, што пад Мінскам, быў ажыццёўлены запуск атамнага рэактара магутнасцю 2000 кВт, які ў далейшым быў уключаны ў склад Інстытута энергетыкі АН БССР. Перад беларускімі навукоўцамі адкрыліся вялікія магчымасці для эксперыментальных прац па мірным выкарыстанні атамнай энергіі. У 1965 годзе быў створаны Інстытут ядзернай энергетыкі, дырэктарам стаў акадэмік А. К. Красін. Пры садзейнічанні навукоўцаў Інстытута атамнай энергіі імя І. В. Курчатава АН СССР у Інстытуце ядзернай энергетыкі разгарнуліся даследчыя і праектна-канструктарскія работы па стварэнні рэактараў, у якіх атамная энергія пераўтворыцца ў электрычную. Праводзіліся даследаванні па вадароднай энергетыцы, радыяцыйнай хіміі і радыяцыйнай мадыфікацыі матэрыялаў. Тут сталі атрымліваць вельмі неабходныя для патрэб прамысловасці, сельскай гаспадаркі і медыцыны кароткажывучыя ізатопы.

Цэлай эпохай у развіцці Акадэміі навук сталі гады, калі яе прэзідэнтам з’яўляўся М. А. Барысевіч (1969–1987 гг). Неабходна

зазначыць, што ў 70-я гг. XX стагоддзя Акадэмія навук БССР мела яскрава акрэсленыя напрамкі навуковых даследаванняў і валодала моцным, добрападрыхтаваным навуковым патэнцыялам. Дзеля паспяховага руху наперад патрэбны былі сур'ёзныя намаганні і дзяржаўная падтрымка. Ужо ў пачатку 1970 года для паскарэння навукова-тэхнічнага прагрэсу Акадэмія навук сумесна з адпаведнымі міністэрствамі і ведамствамі, прадпрыемствамі, ВНУ выпрацавала комплекс мер па развіцці і павышэнні эфектыўнасці фундаментальных і прыкладных даследаванняў. Шмат было здзейснена для павышэння ролі навукі ў вырашэнні найважнейшых народнагаспадарчых праблем і ўдасканалення сістэмы вышэйшай адукацыі.

Разгарнулася вялікая праца па стварэнні матэрыяльнай навуковай базы. З бюджэту СССР сталі вылучацца ў павялічаных аб'ёмах асігнаванні на навуковыя даследаванні і капітальнае будаўніцтва, што дазволіла ў сціслы тэрмін ажыццявіць істотныя структурныя пераўтварэнні. У 1970 годзе на 160 гектарах разгарнулася будаўніцтва Акадэмгарадка, заснавана Цэнтральнае канструктарскае бюро з доследнай вытворчасцю. У наступныя гады былі адкрыты яшчэ 9 канструктарскіх бюро з доследнай вытворчасцю пры інстытутах Аддзялення фізікі, матэматыкі і інфарматыкі, Аддзялення фізіка-тэхнічных навук. Для інстытутаў хімічнага і біялагічнага профілю было створана 5 эксперыментальных баз. За 1970–1986 гады ўведзена ў дзеянне 30 буйных акадэмічных аб'ектаў.

Дасягненні акадэмічных навукоўцаў па шэрагу важных навуковых кірункаў атрымалі прызнанне не толькі ў СССР, але і за мяжой. Вялікай падзеяй у жыцці Акадэміі стала ўзнагароджанне ў 1978 годзе яе калектыву ордэнам Леніна за заслугі ў развіцці навукі, эканомікі і культуры, падрыхтоўцы высокакваліфікаваных навуковых кадраў і ў сувязі з 50-годдзем з дня заснавання. Усяго з 1970 па 1986 гады акадэмічным вучоным было прысуджана 14 Дзяржаўных прэмій СССР, 43 Дзяржаўныя прэміі БССР і 19 прэмій Ленінскага камсамола.

Перабудова, а затым і распад СССР выклікалі цэлую хвалю негатыўных працэсаў, у тым ліку і ў навуцы. Былі парушаны

ўсталяваныя за дзесяцігоддзі народнагаспадарчыя і навуковыя сувязі, што прывяло да стыхійнага разбурэння навукі.

Важнай падзеяй, якая яскрава сведчыць аб падтрымцы дзяржавай акадэмічнай навукі стала прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 15 мая 1997 года «Аб Нацыянальнай акадэміі наук Беларусі». Гэты лёсавызначальны дакумент надаў новы імпульс развіццю навукі. Акадэмія была ператворана ў Нацыянальную акадэмію навук са статусам вышэйшай дзяржаўнай навуковай арганізацыі Беларусі. На яе ўскладалася адказнасць за арганізацыю, каардынацыю і правядзенне фундаментальных навуковых даследаванняў у краіне. Было ажыццёўлена ўдасканаленне нарматыўна-прававой базы, што спрыяла паступоваму ўзнаўленню ўплыву навукі на развіццё эканамічнага патэнцыялу краіны, сацыяльнай і культурнай сферы, дазволіла калектыву навукоўцаў НАН Беларусі на чале з яе прэзідэнтам А. П. Вайтовічам (1997–2000 гг.) больш актыўна і мэтанакіравана канцэнтраваць сілы і сродкі на прыярытэтных напрамках развіцця навукі і вытворчасці.

Загадам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 19 кастрычніка 2001 года на пасаду Прэзідэнта НАН Беларусі быў прызначаны доктар эканамічных навук, вядомы дзяржаўны дзеяч М. У. Мясніковіч. Абапіраючыся на напрацаваны вопыт кіравання, створаную сістэму арганізацыйнай структуры акадэмічнай навукі, былі прыняты рашэнні, якія не дазволілі разбурыць нацыянальнай сутнасці навукі ў працэсе ажыццяўлення аб'ектыўна наспелых арганізацыйных пераўтварэнняў. Пераадольваючы аб'ектыўныя і суб'ектыўныя складанасці, дзякуючы намаганням Прэзідыума Акадэміі навук, акадэмічная навука значна наблізілася да патрэб рэальнага сектара эканомікі.

З снежня 2010 года Старшынёй Прэзідыума НАН Беларусі быў прызначаны доктар тэхнічных навук, прафесар А. М. Русецкі. За кароткі час былі ўдакладненыя навуковыя праграмы, вызначаліся найбольш патрэбныя напрамкі даследаванняў, якія адпавядаюць павышэнню эфектыўнасці развіцця прамысловасці, сельскай гаспадаркі і стану беларускага грамадства.

# СОДЕРЖАНИЕ

## *ПЛЕНАРНОЕ ЗАСЕДАНИЕ*


*А. А. Каваленя.* **Інстытут беларускай культуры – шлях да Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі** ........ 3

*І. І. Шаўчук.* **Інбелкульт як інстытуалізацыйная аснова навукі Беларусі найноўшага часу** ........ 21

*Г. В.Корзенко.* **Институт белорусской культуры и формирование национальной системы подготовки научных кадров (20–30-е гг. XX в.)** ........ 29

*В. И. Васильев.* **Деятельность Научного Совета по книгоизданию при Международной ассоциации академий наук по формированию научного сотрудничества в сфере изучения книжной культуры** ........ 40

*М. Ю. Киселев.* **Источниковедческая база по истории науки и культуры Беларуси в информационной системе Архива Российской академии наук** ........ 45

*А. В. Статкевіч-Чабаганаў.* **Некрашэвічы герба «Любіч»** ........ 50


*Секция 1*

## *ИНСТИТУТ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ: СТАНОВЛЕНИЕ И ДЕЯТЕЛЬНОСТЬ*


*М. У. Токараў.* **Ад Інстытута беларускай культуры да Акадэміі навук** ........ 61

*В. К. Шчэрбін.* **Інбелкульт як правобраз беларускай Акадэміі навук** 68

*Л. М. Лыч.* **Інстытут беларускай культуры ў святле дзяржаўнай палітыкі беларусізацыі** ........ 75

*О. Н. Левко.* **Значение Инбелкульта в становлении и развитии белорусской археологии** ........ 88

*Л. И. Тегако.* **Развитие антропологических исследований в Институте белорусской культуры** ........ 96

*О. А. Гапоненко.* **Институт белорусской культуры и формирование научного сообщества физиков Беларуси** ........ 100

*Я. І. Грыневіч.* **Інстытут беларускай культуры і развіццё фалькларыстыкі** ........ 108

*Ю. В. Нестерович.* **Развитие археографии в Институте белорусской культуры и сложности в осуществлении археографической работы.** 113

*У. І. Кулiковiч.* **Тэорыя Пiсьма ў працах мовазнаўцаў Iнбелкульта** ........ 115

*І. У. Галуза.* **Слоўнікавая праца ў Інбелкульце** ........ 121

*Я. М. Сцепановіч.* **Інбелкульт і нацыянальная навукова-тэхнічная тэрміналогія** ........ 128

*Н. М. Пурышева.* **Инбелкульт и художественная культура БССР: аспекты взаимодействия (первая половина 1920-х гг.)** ........ 133

*Н. Ю. Березкина.* **Из истории библиотеки Института белорусской культуры** ........ 140

*У. І. Кулiковiч, В. В. Гецьман.* **Выданні Інбелкульта, прысвечаныя беларускай мове: рэдактарскі аспект** ........ 144

*І. В. Соркіна.* **Дзейнасць Цэнтральнага бюро краязнаўства па вывучэнні мястэчак Беларусі: па матэрыялах часопіса «Наш край» (1925–1930 гг.)** ........ 148

*К. М. Лютыч.* **Інбелкульт і краязнаўчы рух (паводле раздзелу «хроніка» часопіса «Наш край»)** ........ 155

*Е. Н. Филатова.* **«Zeitschrift» как популяризатор истории еврейского народа** ........ 161

*Н. В. Мартынава.* **Сумесныя этнаграфічныя даследаванні Інстытута беларускай культуры і Беларускага дзяржаўнага музея** ........ 163

*Т. І. Доўнар.* **Супрацоўніцтва БДУ і Інбелкульта ў сферы юрыспрудэнцыі** ........ 171

*І. А. Саракавік.* **Інбелкульт у беларуска-ўкраінскіх навуковых стасунках** ........ 177

*Секция 2*

***ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПОЛИТИКА В СФЕРЕ НАУКИ И КУЛЬТУРЫ. ОРГАНИЗАЦИОННАЯ СТРУКТУРА НАУКИ И КУЛЬТУРЫ***

*С. В. Хамутовская.* **Основные характеристики кадрового потенциала, занятого научными исследованиями и разработками в Беларуси** ... 186

*С. И. Булойчик.* **Стимулирование поступлений внебюджетных средств как одно из направлений государственной политики в сфере культуры** ........ 190

*С. В. Лапина.* **Научная коммуникация в современном белорусском обществе** ........ 195

*К. Н. Соколов.* **Историография государственного руководства и управления наукой в БССР (1921–1941 гг.)** ........ 202

*В. М. Бароўская.* **Становішча Мінскага беларускага педагагічнага інстытута падчас польска-савецкай вайны 1919–1920 гг.** ........ 208

*Е. В. Зубревич.* **Управление и регламентация театрального дела Витебска в послереволюционный период (1918–1926 гг.)** ........ 214

*Р. І. Ермашкевіч, І. Ф. Раманоўскі.* **Беларусізацыя 1920-х гг.: здабыткі і ўрокі** ........ 220

*А. В. Сумко.* **Роля дзяржаўных і партыйных органаў кіравання ў фарміраванні арганізацыйнай структуры кнігавыдавецкай справы бсср (1920-я гг.)** ........ 224

*М. К. Альховік.* **Беларуская Акадэмія навук і нацыянальна-культурнае будаўніцтва ў 1929–1934 гг.** ........ 228

*А. А. Савіч.* **Сучасная гістарыяграфія дзейнасці Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі (1920–1930-я гг.)** ........ 234

*А. А. Крыварот.* **Дзейнасць вышэйшых дзяржаўных органаў БССР па разгортванні навуковых структур у 1924 – пачатку 1927 г. (па архіўных матэрыялах)** ........ 242

*И. Н. Шарый.* **Развитие системы подготовки научных кадров высшей квалификации в БССР с 1960 по 1990 г.** ........ 249

*В. С. Глинка.* **Развитие научно-исследовательской работы студентов в системе высшего исторического образования Беларуси во второй половине 1980-х – 1990-х гг.** ........ 254

*О. А. Волочко.* **Белорусская Православная Церковь в системе светского образования (1990-е – начало 2000-х гг.)** ........ 261

*Секция 3*

***РАЗВИТИЕ ГУМАНИТАРНЫХ И ЕСТЕСТВЕННЫХ НАУК***

*В. Ф. Берков, Я. С. Яскевич, А. А. Легчилин.* **К истории развития логической мысли в Беларуси** ........ 270

*Т. И. Адуло.* **Становление философской науки в Беларуси в 20–30-е гг. XX в.** ........ 277

*И. В. Котляров.* **Социология в системе академического знания: история и современность** ........ 284

*М. К. Кошелев.* **Развитие академического сектора исследований по всеобщей истории** ........ 291
*Н. І. Куракевіч.* **Станаўленне педагагічнай навукі ў савецкай Беларусі ў 20-я гг. XX ст.** ........ 300
*Н. В. Дроздова.* **История развития белорусской социальной психологии в период с 1960 по 1991 г.** ........ 307
*И. И. Калачева.* **Научно-педагогический потенциал этнологии как области гуманитарного знания** ........ 313
*Е. А. Антипова, Л. В. Фокеева.* **Депопуляция как предметная область междисциплинарных исследований в Республике Беларусь** ........ 318
*Карелина В. А., Крючков А. Н.* **От градусных измерений до цифровой картографии: из истории картографо-геодезических работ в Беларуси** ........ 324
*В. А. Снытко, В. С. Хомич, Н. К. Чертко.* **История развития геохимии ландшафта в Беларуси** ........ 331
*М. В. Глеб.* **Документы Центрального научного архива НАН Беларуси как источник по истории академической науки** ........ 338
*І. А. Пушкін.* **Архіўныя матэрыялы Магілёўскай гарадской секцыі навуковых работнікаў як крыніца гісторыі развіцця навукі ў рэгіёнах (1930-я гг.)** ........ 342
*Т. А. Платонова.* **Коллекция кинотехники Политехнического музея – путеводитель по истории науки и культуры** ........ 348
*В. А. Снытко, В. А. Широкова, В. А. Низовцев, Н. Л. Фролова.* **Историко-научные экспедиции по историческим водным путям** ........ 353

*Секция 4*

***ФОРМИРОВАНИЕ НАУЧНОЙ ИНТЕЛЛИГЕНЦИИ. ПЕРСОНАЛИИ***

*А. Н. Кукса.* **Н. К. Ярошевич – создатель высшей технической школы в Беларуси** ........ 360
*Л. Д. Бондарь.* **Академик Е. Ф. Карский и становление науки в Беларуси (по материалам Санкт-Петербургского филиала архива Российской Академии наук)** ........ 365
*Р. Г. Гарэцкі.* **Інбелкульт і браты Гарэцкія** ........ 372
*В. М. Баразноўская.* **У. М. Ігнатоўскі і фарміраванне навуковай інтэлігенцыі ў БССР** ........ 378
*С. А. Траццяк.* **У. М. Ігнатоўскі – метадолаг гістарычнай навукі Беларусі** ........ 382
*Н. І. Саўчанка.* **Беларускі фатограф Леў Дашкевіч і Інбелкульт** ........ 389

*А. К. Дубовик, Е. А. Дубовик.* **Научная и общественная деятельность С. Я. Вольфсона** ........ 392

*Ю. Л. Хвіланчук.* **Язэп Лёсік як даследчык сінтаксісу беларускай мовы** ... 398

*А. С. Баранава.* **Роля Браніслава Тарашкевіча ў развіцці беларускай асветы** ........ 403

*Э. Р. Іоффе.* **У. І. Пічэта і Інстытут беларускай культуры** ........ 410

*Д. Н. Бакун.* **В. И. Пичета как деятель книжной культуры Беларуси** ... 418

*І. А. Саракавік, Н. І. Кулік.* **У. І. Пічэта як гісторык права** ........ 423

*М. И. Старовойтов.* **Формирование научной и творческой интеллигенции в условиях белорусизации и украинизации** ........ 429

*У. І. Навіцкі.* **Другая хваля палітычнай рэабілітацыі ў Беларусі: складанасці вяртання з забыцця былых «нацдэмаў» (1987–1990 гг.)** ........ 435

*А. Ф. Клишин.* **Как партизаны спасли ученых** ........ 440

*С. Н. Темушев.* **Концепция общественного строя восточных славян Раннего средневековья в трудах профессора А. П. Пьянкова** ........ 450

*М. В. Стрелец.* **Научно-педагогическая деятельность Л. С. Абецедарского: некоторые аспекты современного осмысления** ........ 457

*А. Н. Кукса.* **Владимир Шкателов – академик в области лесохимии** .... 461

*Секция 5*

***ИСТОРИЯ И ИСТОРИОГРАФИЯ ОТЕЧЕСТВЕННОЙ КУЛЬТУРЫ***

*Т. В. Габрусь.* **Падмурак айчыннага мастацтвазнаўства** ........ 465

*В. У. Дадзіёмава.* **Гісторыя музычнай культуры Беларусі X–XIX стст.: асноўныя крыніцы** ........ 472

*Т. Г. Мдивани.* **Белорусское академическое музыкознание 1926–2011 гг.** ... 485

*И. Н. Липай.* **Аналитический обзор литературы по проблеме изучения музыкальной культуры** ........ 490

*И. И. Бодунова.* **Возникновение теории европейского танца** ........ 498

*А. І. Богдан.* **Помнікі мемуарнага жанру беларускага пісьменства як крыніца вывучэння гісторыі і культуры** ........ 503

*О. Д. Баженова.* **Альбом рисунков Д. М. Струкова 1864 г. как источник по истории белорусской культуры: концепт и контекст альбома** ... 510

*Н. Л. Бахановіч.* **Мастацкая канцэпцыя асобы на мяжы XIX–XX стст. у аспекце фарміравання нацыянальнай інтэлігенцыі** ........ 515

*Н. Ю. Кривопалова.* **Особенности формирования новой культуры Советской России в 1919–1921 гг. (на материалах г. Самары и г. Казани)** .. 520

*Э. Б. Ершова.* **Алгоритм развития культуры Беларуси в 20-е гг. XX в.** .... 527
*Е. А. Сайко.* **Миф о городе как поиск духовного «Дома»**........................ 535
*Н. В. Гальго.* **З гісторыі напісання рамана І. Шамякіна «Атланты і карыятыды»**........................................................................................ 541
*Т. С. Будзянкова.* **Гістарыяграфія гісторыі мастацкай культуры БССР (1945–1991 гг.): дасягненні і перспектывы**.................................. 548
*А. Г. Бураўкін.* **Нацыянальная культура – сістэма інтэграцыі гуманітарных і дакладных ведаў**..................................................................... 556
*Т. М. Смоликова.* **Медиакультура и личность: особенности взаимодействия в современном белорусском обществе**...................................... 560
*О. Г. Шевченко.* **Музыкальное воспитание как фактор становления духовной культуры личности**........................................................................ 567

*Секция 6*

***ИСТОРИОГРАФИЯ И ИСТОЧНИКИ ПО ИСТОРИИ БЕЛАРУСИ***

*Г. Н. Поплевко* **Кремневые орудия на пластинах стоянки Старые Войковичи-1 (по данным трасологического анализа)**................................ 575
*А. А. Башкоў.* **Гісторыя вывучэння археалагічных даследаванняў ў Беларусі другой паловы XIX – першай трэці XX ст.** ......................... 580
*В. У. Мядзведзева.* **Гістарыяграфія развіцця беларускай археалагічнай навукі**................................................................................................. 586
*М. М. Самонава.* **Беларускія землі ў карціне свету скандынаваў**........ 594
*А. В. Демидович.* **Социально-экономический фактор в формировании ренессансной культуры Беларуси в исследованиях белорусской советской историографии 1920-х гг.** ............................................ 597
*П. П. Ільічова.* **Гісторыя роду Радзівілаў у айчыннай і сусветнай гістарыяграфіі**.................................................................................................. 604
*В. Ю. Багачова.* **Гістарыяграфія па тэме «Традыцыйныя вясельныя галаўныя ўборы Беларусаў XIX – першай паловы XX ст.»**................ 609
*Е. В. Комлева.* **Предпринимательская деятельность выходцев Беларуси в Сибири (XIX – начало XX в.)**..................................................... 613
*А. У. Ерашэвіч.* **Развіццё гістарычных ведаў на землях Беларусі (1810-пачатак 1860-х гг.): здабыткі гістарыяграфіі, перспектывы далейшых даследаванняў**........................................................................... 618
*А. Э. Фірыновіч.* **Даследчая дзейнасць Інстытута гісторыі НАН Беларусі па вывучэнні гісторыі паўстання 1863–1864 гг. у святле матэрыялаў ЦНА НАН Беларусі** ............................................................ 626

*Л. Е. Горизонтов.* **Оценки западнорусизма в историографии: судьба традиции эпохи советской белорусизации** ........ 631

*М. И. Матюшевская.* **Университетские исторические школы в России рубежа XIX–XX вв. и проблема изучения московской школы в отечественной историографии** ........ 635

*А. І. Дзярновіч.* **Станаўленне беларускай гістарыяграфіі ў 1920-х гг.: новыя шансы і магчымыя праблемы** ........ 642

*І. Р. Кулевіч.* **Беларускае пытанне ў польскай даваеннай гістарыяграфіі** ........ 650

*Л. Ч. Дрожжа.* **Актуальныя напрамкі вывучэння заходнебеларускай праблематыкі сучаснымі беларускімі і замежнымі гісторыкамі** ........ 656

*С. В. Кулинок.* **План развития партизанского движения и действий партизанских отрядов зимой 1942–1943 гг. как исторический источник** ........ 663

*Ю. В. Кірчук.* **Гістарыяграфія па тэме выкарыстання працы ваеннапалонных у пасляваенным аднаўленні прамысловасці і транспарту Беларусі** ........ 669

*В. С. Сакович.* **Аграрные проблемы Беларуси в отечественной историографии 1980–2000-х гг.** ........ 674

*И. А. Фролов.* **Историография развития исторической науки в Республике Беларусь на современном этапе** ........ 682

*Л. Е. Лойко.* **Эволюция исторических наук в аспекте смены методологических исследовательских программ** ........ 687

*Секция 7*

***МЕЖДУНАРОДНЫЕ НАУЧНЫЕ И КУЛЬТУРНЫЕ СВЯЗИ***

*О. Н. Жарикова.* **Мобильность ученых в границах международного научно-образовательного пространства** ........ 694

*К. А. Крывічаніна.* **Міжнародная мабільнасць вучоных НАН Беларусі (1991–2000 гг.)** ........ 699

*Н. В. Вдовина.* **Россия и страны СНГ в контексте научного диалога: тенденции взаимодействия** ........ 709

*В. К. Савченко.* **История развития международного сотрудничества ученых Беларуси в рамках программы ЮНЕСКО «Человек и биосфера» (1980–2010 гг.)** ........ 712

*С. Ф. Свилас.* **Об участии ученых АН БССР в международном сотрудничестве в области ядерной энергетики (вторая половина 1950-х гг.)** ........ 720
*В. А. Матусевіч.* **Беларуска-польскія навуковыя кантакты ў сферы вывучэння становішча беларусаў у міжваеннай Польшчы** ........ 727
*Т. А. Поповская.* **Из истории развития белорусско-молдавских культурных связей** ........ 732
*А. В. Николенко.* **Письма белорусских исследователей к П. Н. Беркову как источник для изучения российско-белорусских научных и культурных связей** ........ 740
*М. А. Ермолаева, Л. А. Авгуль.* **О некоторых итогах научного сотрудничества в области книжной культуры** ........ 744
**Сведения об авторах** ........ 750
**Список аббревиатур** ........ 759

**Институт** белорусской культуры и становление науки
И71 в Беларуси: к 90-летию создания Института белорусской культуры: материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8–9 дек. 2011 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск: Белорус. наука, 2012. – 769 с.
ISBN 978-985-08-1464-7.

Сборник содержит материалы Международной научной конференции «Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси. К 90-летию создания Института белорусской культуры», которая проводилась 8–9 декабря 2011 г. в Минске.

Тематика докладов представлена по следующим секциям: «Институт белорусской культуры: становление и деятельность», «Государственная политика в сфере науки и культуры. Организационная структура науки и культуры», «Развитие гуманитарных и естественных наук», «Формирование научной интеллигенции. Персоналии», «История и историография отечественной культуры», «Историография и источники по истории Беларуси», «Международные научные и культурные связи».

Издание может быть интересно историкам-исследователям, преподавателям и студентам, всем кто увлекается историей отечественной науки и культуры.

**УДК 008(=161.3):[001.891:005.71](476)(082)**
**ББК 71(4Беи)я43**

Научное издание

**ИНСТИТУТ БЕЛОРУССКОЙ КУЛЬТУРЫ**
**И СТАНОВЛЕНИЕ НАУКИ В БЕЛАРУСИ**

**К 90-летию создания Института белорусской культуры**

*Материалы Международной научной конференции*
*Минск, 8–9 декабря 2011 г.*

Редактор *Н. В. Яковенко*

Художественный редактор *Т. Д. Царева*

Технический редактор *М. В. Савицкая*

Компьютерная верстка *Ю. А. Агейчик*

Подписано в печать 27.08.2012. Формат $60 \times 84^{1}/_{16.}$ Бумага офсетная. Печать цифровая. Усл. печ. л. 44,76. Уч.-изд. л. 40,0. Тираж 300 экз. Заказ 164.

Издатель и полиграфическое исполнение:
Республиканское унитарное предприятие
«Издательский дом «Беларуская навука». ЛИ № 02330/0494405 от 27.03.2009.
Ул. Ф. Скорины, 40, 220141, г. Минск.